# Прэзентацыя па беларускай мове па тэме

# «Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе»

*для слухачоў падрыхтоўчага аддзялення, падрыхтоўчых курсаў, абітурыентаў*

Складальнік – дацэнт Чайкова С.В.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе

утварэнне дзеепрыметнікаў;

ужыванне дзеепрыметнікаў; ;

правапіс *не* (*ня*) з дзеепрыметнікамі;

правапіс суфіксаў дзеепрыметнікаў;

утварэнне дзеепрыслоўяў;

ужыванне дзеепрыслоўяў;

правапіс *не* (*ня*) з дзеепрыслоўямі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# ДЗЕЕПРЫМЕТНІК
## Утварэнне дзеепрыметнікаў

| *Стан і час дзеепрыметнікаў* | *Утвараюцца* | | *Прыклады* |
|---|---|---|---|
| | ад асновы: | пры дапамозе суфіксаў: | |
| Незалежны / прошлы | інфінітыва | **-л-,**<br>**-ўш-, -ш-** | *пасіве**л**ы,*<br>*прыляце**ўш**ы,*<br>*прынёс**ш**ы* |
| Залежны / прошлы | дзеясловаў прошлага часу | **-н-, -ен-, -ан-,**<br>**-т-** | *напіса**н**ы, асветл**ен**ы,*<br>*дагледж**ан**ы,*<br>*пашы**т**ы* |
| Незалежны / цяперашні | дзеясловаў<br>I спражэння | **-уч-**<br>**-юч-** | *бяг**уч**ы рахунак,*<br>*раша**юч**ая сіла* |
| | дзеясловаў<br>II спражэння | **-ач-**<br>**-яч-** | *гавор**ач**ая асоба,*<br>*свіц**яч**ы гук* |
| Залежны / цяперашні | непераходных дзеясловаў цяперашняга часу незакончанага трывання | **-ем-**<br>**-ім-** | *кіру**ем**ы,*<br>*утвара**ем**ы* |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Ужыванне дзеепрыметнікаў

**Не ўсе формы дзеепрыметнікаў аднолькава ўжывальныя ў сучаснай беларускай мове.**

- **Найчасцей выкарыстоўваюцца дзеепрыметнікі прошлага часу залежнага стану з суфіксамі -*н-, -ен-, -ан-, -т-*: *стомлены чалавек, скошаная трава.***
- **Часта ўжываюцца дзеепрыметнікі прошлага часу незалежнага стану з суфіксам *-л-*: *пачарнелы слуп, пажаўцелае лісце.***
- **Дзеепрыметнікі прошлага часу незалежнага стану з суфіксамі *-ўш-, -ш-* сустракаюцца пераважна ў публіцыстычным і навуковым стылі: *вырасшыя патрабаванні, узмацнеўшыя сувязі.***
- **Дзеепрыметнікі цяперашняга часу з суфіксамі -уч-(-юч-), -ач- (-яч-), -ем- (-ім-) ужываюцца вельмі рэдка, пераважна ў складзе ўстойлівых спалучэнняў тыпу *кіруючая сіла, узрастаючая роля, бягучы рахунак, кіруемая.***
- **Для беларускай мовы не характэрны зваротныя дзеепрыметнікі (з постфіксам -ся) тыпу *выдаваўшыся часопіс, прагаладаўшыеся дзеці* (па-беларуску так гаварыць і пісаць нельга!).**
- **Варта пазбягаць выкарыстання дзеепрыметнікаў незалежнага стану з суфіксамі *–ўш-, -ш-* у форме Н. скл., якія супадаючы з дзеепрыслоўямі, робяць думку сказа невыразнай: *Хлопец, чытаўшы кнігу, нікога не заўважаў навокал*** (незразумела, ці то хлопец, які чытаў кнігу, нікога не заўважаў, ці то ён не заўважаў нікога ад таго, што чытаў).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ
ИМ.Ф.СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Правапіс не (ня) з дзеепрыметнікамі

| Разам | Асобна |
|---|---|
| • калі дзеепрыметнік без не-(ня)- не ўжываецца: *неадольны;*<br>• з поўнымі дзеепрыметнікамі, калі яны не маюць пры сабе паясняльных слоў: *неасушанае балота, незасеянае поле;*<br>• з дзеепрыметнікамі, пры якіх ужываюцца паясняльныя словы са значэннем ступені якасці: вельмі, выключна, у вышэйшай ступені, надзвычай, зусім, амаль, часткова, цалкам, поўнасцю, абсалютна: *зусім непрадуманае выступленне, выключна неабдуманы ўчынак;*<br>• у складзе прыстаўкі неда-: *недаспелыя чарніцы.* | • з поўнымі дзеепрыметнікамі, калі яны маюць паясняльнае слова: *не засеянае* (кім?) *калгаснікамі поле;*<br>• калі пры дзеепрыметніках ёсць або падразумеваецца супрацьпастаўленне: *На стале ляжала не скончанае, а толькі пачатае пісьмо;*<br>• з кароткімі дзеепрыметнікамі: *поле не засеяна;*<br>• у складзе ўзмацняльных ад-моўяў: далёка не..., даўно не...: *далёка не прадуманае рашэнне;*<br>• са словамі яшчэ не, ніколькі не: *яшчэ не падрыхтаваны рэферат* |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Правапіс суфіксаў дзеепрыметнікаў

<table>
<tr><th>-н-</th><th>-ен-</th><th>-ан-</th></tr>
<tr><td rowspan="3">Суфікс -н- маюць дзеепрыметнікі, утвораныя ад асновы інфінітыва на -а/-я:<br>абстраляць – абстраляны выгадаваць – выгадаваны<br>засыпаць – засыпаны<br>пасеяць – пасеяны</td><td>пасля галосных і мяккіх зычных</td><td>пасля цвёрдых зычных</td></tr>
<tr><td colspan="2">маюць дзеепрыметнікі, утвораныя ад асновы інфінітыва<br>з асновай на зычны або на галосныя на –і /-ы, -е:</td></tr>
<tr><td>асвятліць –асветлены<br>завезці – завезены<br>загаіць – загоены<br>занесці – занесены<br>паклеіць – паклееены<br>напаіць –напоены<br>падмесці –падмецены<br>скласці – складзены</td><td>запрасіць –запрошаны<br>вырашыць – вырашаны<br>дагледзець – дагледжаны<br>залячыць – залечаны<br>прыцярушыць – прыцярушаны<br>дапусціць – дапушчаны</td></tr>
<tr><td>Заўвага!<br>У беларускай мове дзеепрыметнікі залежнага часу прошлага часу пішуцца з адной літарай -н-</td><td colspan="2">Заўвага!<br>Перад суфіксам -н- захоўваецца галосная, якая была ў аснове інфінітыва: авеяць – авеяны, засеяць – засеяны, паказаць – паказаны, развеяць – развеяны.</td></tr>
</table>

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# ДЗЕЕПРЫСЛОЎЕ

- Утварэнне дзеепрыслоўяў

| *Трыванне дзеепрыслоўяў* | *Дзеепрыслоўі ўтвараюцца* | | *Прыклады* |
|---|---|---|---|
| | ад асновы дзеяслова | пры дапамозе суфіксаў | |
| **Незакончанае (*што робячы?*)** | цяперашняга часу I спражэння | **-учы -ючы** | ***пішучы малюючы*** |
| | цяперашняга часу II спражэння | **-ачы -ячы** | ***лежачы стоячы*** |
| **Закончанае (*што зрабіўшы?*)** | прошлага часу: аснова на галосны | **-ўшы** | ***стаяўшы*** |
| | **аснова на зычны** | **-шы** | ***апёкшы*** |

# Ужыванне дзеепрыслоўяў

Дзеепрыслоўе, абазначаючы дадатковае дзеянне, адносіцца не толькі да выказніка, але і да дзейніка, г.зн. асноўнае і дадатковае дзеянне павінна выконвацца адной і той жа асобай (прадметам):

*Алесь спыніўся, прайшоўшы з кіламетр.*

*(Алесь спыніўся і Алесь прайшоў).*

- **Існуюць два прыёмы самаправеркі правільнасці ўжывання дзеепрыслоўяў:**

| | |
|---|---|
| **перабудова сказа: замена дзеепрыслоўя дзеясловам, затым злучэнне аднародных дзеясловаў злучнікам і:** *Алесь спыніўся, прайшоўшы з кіламетр. — Алесь прайшоў з кіламетр і спыніўся.* | **дзеепрыслоўе можна пераставіць бліжэй да дзейніка:** *Алесь спыніўся, прайшоўшы з кіламетр.— Алесь, прайшоўшы з кіламетр, спыніўся.* |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Правапіс не (ня) з дзеепрыслоўямі

| *Разам* | *Асобна* |
|---|---|
| • калі дзеепрыслоўе без ***не-***(***ня-***) не ўжываецца: *ненавідзячы, непакоячы.* | • з большасцю дзеепрыслоўяў: *не шкадуючы, не адпачнуўшы.* |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ
ИМ.Ф.СКОРИНЫ

# Дзякуй за ўвагу

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ
ИМ.Ф.СКОРИНЫ